БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible]
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 29. Менск. Пятніца 26 красавіка 1918 г. Год I

Менск 26/IV.

... Соцыялізазыя мададых кабет у Саратаве... разгром Каканды... сьвярбелі рукі ад таго што Баку ішчэ цэлы стаіць,—цяпер ужо і Баку зраунялі з зямлей... гэта там! А тут у Беларусі—як ветрам зьняло усе «углубіцельныя» ідэі «соцыялізму», зробленнаго у Туле.

Хто цяпер прыедзе у беларускую мястэчковую правінцыю дзівіцца якая творчая энэргія абудзілася у краі. На усіх палех кініць работа, аруць, возяць гной, сеюць з нейкім замілаваннем, гародзяць агароды, сады, двары, каб усе была «як дауней—па гаспадарску. Пачуу беларус, узяушысь за саху, жывучую аздарауляючую, вечную маладую, старую матку зямліцу. Можна зауважыць, каля таго, як тут за 2 годы вайны перэбывалі мільены чужынцоу, што тутэйшыя людзі больш зблізіліся між сабою. А тут, як прапало усе расійскае начальство, усе пачулі на сабе жар абавязку зрабіць які небудзь парадак, свой парадак каторы патрэбны для нормальнаго жыцця.

Край традыцый і старасьведчыны.

Беларус консэрватор ад натуры перш за усе як каранны земляроб, а другое—такім зрабіла яго гісторыя. Ен цярпеу то рэлігійныя насілія, то русіфікацыю, то палянізацыю, і прайшоу праз соткі гадоу, затрымаушы у чыстаце сваю мову, звычай юрыдычнае права народны эпос, свае рэлігійныя пагляды і пашанаванне да усялякай чужой веры. Наймацнейшы аргумэнт: «нехай будзе, як дауней».

Новы стыль зрабіу тое, што каталікі сьвяткавалі ужо Вялікдзень, а праваслауная ішчэ пасцяць, і пасцяць ішчэ шчырэй як да аддзялення і папракаюць каталікоу: «на што аддзяліліся? каб вам вантроба аддзялілася! «У звычаях ні любяць навіны.

Рэвалюцыя і мітынгуючая армія, трэба [illegible]знацца, зрабілі агромную [illegible]ую работу у галовах беларускага селянства. Палітычныя гарызонты шырэй адкрыліся, і паднялі розум беларуса на дзержаўную вышыню.

Зямельная справа.

Без эуропэйскай аграрнай рэформы Беларусь ні можэ эканамічна, соцыяльна і палітычна развівацца. Гэтай вясной зямельной вострасьці німа, бо мала насення, мала скаціны. Двары даюць сваю зямлю пад засевы вескам на выгадных варунках. Гэты год хваця і зямлі і пашы для аслабеушаго скатаводства. Другі гаспадарскі год будзе трохі цясней шы. Гэтыя два годы трэба пусціць у ход зямельную рэформу.

На беларускім шляху.

Прафэсар М. Доувар-Запольскі піша у перадавым артыкулі Кіеускаго «Беларускаго Слова» № 2 аб устаунай грамаце Рады Б. Н. Р. ад 24 сакавіка:

«Льос выцягнуты! Вялікі акт у жыцці нашаго народу стауся: Беларусь абвешчана сваім часовым урадам нізалежнай рэспублікай».

Даводзячы наша права на нізалежнасьць наважаны аутар кажа: «Перад прылучэнвем да Расіі Беларусь перажыла з перыоды гістарычнаго жыцця. Да XIV веку яна складалася з некалькіх княствау, з якіх кожнае мело значэнне нізалежнаго гасударства. У XIV в. Беларусь самахвотна злучылася з Літвой і да 1560 году была асобным дзержауным арганізмам. І пасьля 1569 году, злучыушыся актам уніі з Польшчай, Беларусь ні згубіла сваіх сувэрэнных правоу, астаючыся несколькі вякоу фэдэрацыйнай часьцю Польска-Літоуска-Рускай дзержавы. Яна ні была провінцыяй Польшчы, захоуваючы сваю дзержаунасьць. Мы гістарычна прывычаіліся да вольных установау, адабраных у нас Расіяй».

Застанауляючыся над пытаннем, ці на пары была абяулена нізалежнасьць, прафэсар гаворыць: «мы с пэунасьцю можам сказаць адно: другога выйсця ні можа быць»... Пецербурскія рабусьнікі абдзерлі наш край, ні далі злажыцца у ім уладзе на пачатках аутаноміі ці фэдэрацыі і потым кінулі яго на літасьць судзьбы. Вобэц такіх варункау наш урад павінен быу зрабіць тоя, што зрабіу. Другоя пытанне уладзім мы свае жыцце саусім ні ад каго нізалежна, ці войдзем у склад якой небудзь фэдэратыунай комбінацыі. Важна тоя, што цяпер мы будзем выбіраць тую, ці іншую комбінацыю у *згодзе з нашымі інтарэсамі*». (курс. наша) Канчаець артыкул пр. Доунар-Запольскі слоумі: «За дружную працу браты!»

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

Дзеля таго, каб чалавеку істнаваць, патрэбны тры рэчы: хлеб, хлеб і яшчэ раз хлеб. Але пры цяперашніх варунках гэтыя тры рэчы вельмі трудна даюцца... Вынік з гэтаго адзін—німа хлеба. Чуецца гэта нідастача і па вёсках Меншчыны і Віленшчыны. Есьць цэлыя вёскі «безхлебнікаў». Ранейшыя броваркі, дзе жыто пераганялося у гарэлку, потым безталкоўнае ніштчэнне маёнткаў цяпёр даюцца у знакі.

Нігледзючы на гэта раней цягаліся цэлыя абозы з жытняй мукою у Менск. Мука гэта куплялася у даўгінаўскай ваколіцы па 35—40 р. за пуд., а у Менску прадавалася па 70—80 р. Бачучы як дабро вывозіцца з вёскак на вачох галодных людзей, людзі ні вытрымівалі і пускаліся на паleванне—палеванне на хлеб...

У м. Пасадцы, т в. Глубачаны і Крэмянец заўсёды стаяла варта с 5—10 чалавек быўшых «камітэтчыкаў», дэпутатаў вясковых, і пераймала абозы. Калі знаходзілі муку, то забіралі і дзялілі галодным. Рэдка—рэдка, калі удавалося гандляром адбараніцца грашавым выкупам. Бывалі пры гэтым такія самабытныя і ідэлісты у сваей безхлебнай ідэалёгіі, што ні здаваліся на грашавыя пакусы, Цяпер ніхто ім хлеба і за грошы прадаваць ні хоча. Іх атсылаюць у камітэты, або кажуць што німа хлеба у той час, калі спэкулянтам на Менск прадаюць за гэту самую цану (30—40 р. за пуд.).

З.

Агульныя весткі.

РОТТЭРДАМ. 23 г. м. Спэцыяльны коррэспондэнт Reutera пры ангельскай арміі тэлеграфуе: Хаўтыры барона фон Рыхтгофена адбыліся учора пасьля поўдня з вялікай урачыстасьцю. Загінуўшы лётнік пахованы на малом цвінтары каля мейсца ў якім быў застрэляны. Аддзел самалетнаго карэлеўскаго корпусу быў пры гэтым ў пачотнай эскорце.

ПАРЫЖ. (22 г. м. Вольф.) Аг. Гаваса паведамляе: Дальнабойная гармата сягодня зноў абстрэлівала Парыж. Ахвяр ні было.

З БЭРНУ даносяць ад 22 г. м., што французская палата дэпутатаў прыняла закон аб рэквізыцыі урадам вольных памешканняў для размяшчэння уцекачоў з акупіраваных мейсц. Палата запыніла свае пасяэння да 30 красавіка. Сэнат прыняў закон аб тым, што урад мае права упаважняць прэфэктаў на выдаванне распараджэнняў аб дзержаўным апрацаванні грунтаў ні апрацоўваных гаспадаркамі. Сэнат зачыніўся да 7 траўня.

РЫМСКАЯ «Ерокм» піша, што монніньор Ахілес Ротэ глаўны дазорца Ватыканскай бібліотэкі назначаны прэдстаўніком Ватыкану у Парыж.

З ЖЭНЭВЫ даносяць ад 22 г. м., што Французскія сындыкалісты ўважаючы на цяперашняе становішчо пастанавілі ні сьвяткаваць 1 траўню.

БЭРЛІН. 22 г. м., «Вольф» даносіць, што граф фон Гэртлінг прыняў сягоння ў найвыжшай глаўнай кватэры гэнэрал-губэрнатара Бэльгіі ген.-палкоўніка ф. Фалькенгаузен.

З БЭРНУ ад 23 г. м. паведамляюць, што Ллойд-Джордж у сваёй прамові пры 3 чытані закона аб вайсковай службе у ніжняй палаці сказаў, што абецанка даравання Гамруля вымагалася Амэрыкай, каторая апробуючы праэкт закону аб вайсковай службе паставіла варункам даравання Ірляндзіі Гамруля.

АМСТЭРДАМ. 22 г. м. «Вольф». Па атрыманым сюды вёсткам з Англіі сягодня Бонар Лоу падасьць бюджэт. Чакаюць падвыжкі падаткаў на вялікія заходы, спадшчыну, піво, тытунь, цукер. Чакаецца новы падатак на збыткоўныя рэчы, да якіх маюць залічыцца і дарагія вопраткі! Даход с падаткау аблічаецца каля 100 мільён ф. стрл.

ЛЕНДАН. 22. «Вольф» Ангельскім газэтам даносяць с Корню: Вайсковыя, ўлады узялі пад свой загад у Ірляндзіі важнейшыя дарогі, пачтовыя урады, і тэлеграфныя бюро.

АМСТЭРДАМ 22. «Вольф» Паводлуг газэтных паведамленняў, у ам. шт. Оттаве парлямэнт прыняў пастанову, якой дае права ураду зрабіць новы рэкруцкі набор. Прапазыцыя увольніць ад вайск. службы селян—адкінута.

ЛОНДОН 22. «Вольф». Подлуг газэтных вёстак паміж Кітаем і Японяў зроблена важная патаенная умова.

АДЭССА. Ул. Караленко другі раз захварэў на запаленне лёгкіх.

КІЕУ. Паміж палякаў тутэйшых называюць кандыдатам на польскі трон пруск. князя Іохіма, як караля Польшчы і князя Літвы і Курляндзіі.

Другім кандыдатам называ

юць князя Эрнст-Аўгуста с Кумбэрлэнду, зяця імпэратара Вільгэльма.

Князь Эрнст-Аўгуст—з англійскаго роду.

Весткі с Польшчы.

На выбарах у «Раду Сталу» с 53 выбраных членау актывісты, прэдстаунікі якіх стаяць цяпер на чале польскай палітыкі, атрымалі усяго 17 мейсцау, а рэшта дасталася міжпартыйнаму колу. «Коло» гэто выдаю прывыбарах дскларацыю у якой выкануе:«пэунасьць, што Рада стану ні разьвяжа ніякіх спрау, што датыча формы праулення, дзержауных граніцау, так само міжнародных трактатау, пазастауляючы гэтыя справы устаноучаму сойму». Такім чынам яго староннікі з'яуляюцца праціунікамі палітыкі актывістау. Апрача 13 членау Рады па выбару у яе склад маюць увайсці ішчэ 57 чалавек с каторых 45 будзе назначаных. Німа ведама чы кіраунічымі сіламі назначэнне будзе рабіцца стасоуна да скаткау выбарау, ці так каб зроунаваць у Радзе сілы актывістау з сілаю іх праціунікау.

— Даход і расход Варшаускаго генэрал-губэрнатарства, паводлуг зацьвержанаго 3 красавіка бюджэту на 1918 год квітуюцца у сумме 295,800,500 марак. Проці бюджэту 1917 г. бюджэт 1918 г. павялічыуся на 73 мільены мрк. Выдаткі § X A: B (на урад прэссы: аддзел выдауніцтва) аблічаны у суме 2,863,000 мрк. Выдатак § X «Польскіе улады»— 30,000,000 мрк. Апрача ваенных і агульных выдаткау звертаюць на сябе увагу вялікія выдаткі на гаспадарскія патрэбы краю: будова дарог, мясліцтва, зямляробства і т. д.

У Любэльскім генэрал-губэрнатарстве бюджэт „Польскіх уладоу аблічаны: 1) для Рэгенцкай Рады і міністэрствау 9500000 мрк., 2) На юстыцыю 8000000 мрк., 3) на прасьвету 12500000 мрк.—усяго 30000000 мрк.

Весткі з Расіі.

МАСКВА. Уезд у Маскву можа быць толькі з дазволу савецкай улады. Такі дазвол можна купіць с пад палы за 10-20 рублёў.

Жыццё у Маскве кіпіць; там жэ сядзіць і весь спаўняючы камітэт с. р. і с. д. Ленін жыве у Крэмлі, Троцкі — каля цэрквы Спасіцеля. Арганізацыя чырвонай арміі ідзе шпарка наперад: на службу туды ідуць генэралы і афіцэры, каторыя нінавідзяць усякія саветы і гэткім чынам чырвоная армія у хуткім часе можа стацца нібяспечнай для самой савецкай улады.

Зрадзілася нейкая новая бюрократыя—куды гаршая даунейшай—царскай. Скрозь узяткі і подкупы. Усіх левшых людзей захапіу нейкі пэссымізм, найшла апатыя.

Савецкая улада траце грунт пад нагамі і сама няведае чым займацца. Шмат энэргіі патраціла яна на барацьбу з анархістамі, каторых сама узгадавала, а аднак новыя дэкрэты, часам да сьмешпасьці дзікія, някуцца без упынку.

Японскі консул у Маскве зьвярнуўся у коміссарыят заграничных справаў з скаргаю, што руская прэсса бэз патрэбы сея у народзе ніпраўдзівую трывогу. Чыноўнік комісарыяту атказаў на гэта консулу што было-б найлепей, каб японцы адазвалі сваё войско.

Харчовая справа стаіць як найгорш: хлеба выдаецца на $^1/_4$ ф. на чалавека, а ціхачом можна купляць па 4-5 р. за ф.

ПЕЦЕРБУРГ. Горад выміpae Большасьць магазынаў— зачыняны. Трамваі ходзяць пустыя. На вуліцах сумна і глуха. Тэатры зачыняны, але побач з гэтым размножыліся рожныя прытоны і кабакі. Успылі на паверх уселякія «футурызмы».

На чале Пецярбурскай камуны стаіць Зіноуеў. Прыежджаючым с пропусками пассажырам пакідаюць толькі пуд багажу, рэшту ўсё адбіраюць.

Хлеба у прадажы саўсім німа — нат за самую дараг ую цану.

З рожных гарадоў Расіі весткі ідуць самыя сумныя. На пераходзе кардонау расійскіх войск усіх цератрасаюць, адбіраюць рэчы, а то і самых пасажырау арыштовываюць. Займаюцца гэтым ні нейкія назначаныя для гэтаго людзі, а проста каму уздумаецца—«дабравольпамі».

У гарадох і на станцыях ужо ні два а тры начальства: саветы, чырвоная армія і проста бандыты: кожны распрадаецца на сваю руку. Паміж пасажырамі і «начальствам» часта даходзе да бойкі, якая канчаецца ні раз крывавай расправай.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Масноускай дэлегацыі служачых Л.-Р. ж. д. Рада нар. камісарау прапануе зараз пакідаць службу і усім служачым ехац у Маскву дзеля таго, каб разлічылца зусім. Адзін з членау дэлегацыі астауся у Маскве чэкаць ад бальшэвікоу афіцыяльнаго дакумента іх пажаданняу, каб прывесьці у Менск служачым.

Самоабарона пэдагогау у тутэйшых сярэдніх школах пераходзіць уселякія меры. Плата за правоучэнне на другое полугодзье удвоілася—замест 120 р. дайшло да 240 р. (каз. рэяльнае вучылішчэ). Затое растуць аклады паноу пэдагогау: дырэктарам—10,000 руб. на год, вучыцелям—6,000—8000 р.

Але струна лопаецца. С 4-е клясы рэяльнай школы вучні выходзяць. Бацькі стогнуць, бо німа ніякай мажлівасьці плаціць 4 дубэльт...

Цэны на нізкім рынку у сераду 24 і 25 г. м.:

Чорны хлеб—1 р. 80 к. ф.
Сало — 8—9 р. 80 к. „
Каубасы 2—3 - 4 р. — к. „

24 красавіка Народны Сэкрэтарыят зацьвердзіу статут і асабісты склад Беларускай Тарговай Палаты на Украіні. Палата мае мэтаю падладзіць абмен таварау паміж Беларусяй і Украінай і першым чынам арганізаваць і дапамагчы закупцы хлеба і іншых харчоуных рэчау для Беларусі. Старшынею палаты зацьвержаны вядомы беларускі прафэсар М. Доунар-Запольскі Сярод сяброу Палаты між іншым п. Бурчак. быушы Кіеускі гарадзкі галава (беларус) і шмат відных коммарцыйны беларускіх дзеячэу.

Курсы беларусознауства.

26 красавіка.

Александра Уласоу. *Эканамічнае нарысы.*

Пачатак лекцыі у 7 гад. веч.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 25 красавіка 1918 року.

ЗАХОД: На полю бітвы каля р. Ліс м... ная контр-атака французаў на узвышэнне Влетельхэк, бы... адбіта з вялікімі для іх стратамі. Поўн.-зах. Бэтэна, ка... Фестюбера і на абодвых бакох Скарпы мейсцамі адбывалі бai. Поўднёвей Соммы мы атакавалі ангельцаў і францу... каля Віллерсбрэтэннен і поўднёвей яго. У заўзятой схват... наша пяхота пралажыла сабе дарогу праз кулямётныя гнёз... непрыяцеля. Пры гэтым яе добра падтрымоўвалі нашы па... цэрныя самаходы. Мы узялі веску Ангар, за якую ішло до... гае змаганне. На заходнім беразе Авры мы пасунулі св... ліні да узвышэнне поўночна-заходней Кастэля. Непрыяце... увесь дзень падтрымоўвау моцныя атакі войскамі якія зна... ходзіліся на полю бітвы і падыйходзілі с тылу. Яны паця... пелі поўную ніудачу. Зацятыя бai цягнуліся у заваеван... мейсцовасьці усю ноч. У нашых руках асталося больш 20... палонных. Мы узялі 4 гарматы і мноства кулямётаў.

Пэршы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

На моры.

Згодна з паведамленнем начальніка штабу адміралтэ... ства, проба ангельскіх марскіх сілаў зрабіць высадку ... Фляндрыі у ноч з 22 на 23. IV была знеможліўлена. А... гельцы пасьля моцнаго абстрэлу з мора прабавалі ... пады... сьці к берагу хаваючыся за густую дымавую заслону, памі... Остэндэ і Зээбрюгге з Замерам разбурыць знаходзячыеся т... мака шлюзы і портавыя будовы. Нашыя узьбярэжныя бат... рэі патапілі пяць ангельскіх крэйсэраў,—Іфігенія, Інтрэпі... Сіріус і два другіх такога-ж тыпу, тры мінаносцы і шма... падводных лодак. Усе нашыя партавыя пабудовы апрач... молу у Зэбрюгге асталіся ні ушкоджэнымі. Адна наша па... водная лодка атрымала нівялікую шкоду. Нашы страты ... людзях нізначны.

СТУДЭНТКІ і СТУДЭНТЫ БЕЛАРУСЫ.

Моладзь наша, як вучаніцы і вучні, дауно ужо згур... таваліся у гурткі і таварыствы. Німа толькі нашай студэн... кай арганізацыі.

Бацькаушчына наша хутка стане на дарогу жыцця, н... шлях нізалежнаго дзяржаунаго бытавання. Нам трэба цяпе... гатавацца да тае вялікае і адпаведальнае працы, якой за... патрэбуе ад нас нашая спакутаваная айчына. З абвяшчэнне... нізалежнай рэспублікі, Беларусь скінула апошняе ярмо дзяр... жаунай залежнасьці, якое гвалтам было накінуто на яе ма... скоускімі царамі. Чакае нас цяжкая, але салодкая, праца... па адбудаванню свайго роднаго краю. Патрэбны людзі ... разумнае адданне сваіх сіл і здольнасьці дзеля адбудаванн... новае лепшае долі свае айчыны.

Студэнткі і студэнты. Нам трэба арганізавацца, на... трэба злучыць свае сілы, каб агульнымі заходамі, узаемна... дапамогай і братэрскай парадай гатаваць сябе і другіх д... тае вялікае працы, якую павінны мы будзем прынесьці ... аддаць сваей зьнішчаной вайною Бацькаушчыне. Беларусь... нас выгадавала, яна нас выпесьціла, яна вывела нас на шырокі шлях сьвету і знання,—і ей мы павінны аддаць свае сілы ... навуку.

Хто з Вас лічыць сябе сынам Беларусі, хто хоча ей ... лепшай долі, хто ні хоча быць наймітам у чужынцау і хто ... хоча бліжэй азнаеміцца с палітычнымі і культурнымі яе за... даннямі,—той ніхай далучае сябе да БЕЛАРУСКАЙ СТУДЭНЦКАЙ РАЙНІЦЫ, аб якой можна даведацца у памешканню рэдакцыі газэты «Беларускі Шлях», *Серпухоуская, д. № 12.*

Друкарня Я. А. Грынблята.